УДК 72.03(075.8)

# ЯГО НЯМА НА МАПЕ ХРЫСЦІЯНСКАГА ПОЛАЦКА: САБОР СВЯТОГА СТЭФАНА (СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКІ САБОР)

**Лепеш Аксана Васільеўна**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца гісторыя стварэння сабора Святога Стэфана намаганнямі каталіцкага ордэна езуітаў, які быў пераўтвораны ў праваслаўны Свята-Мікалаеўскі сабор пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. Сабор заставаўся перлінай Полацкай хрысціянскай архітэктуры да 1964 г., пакуль не быў знішчаны савецкімі ўладамі падчас антырэлігійнай кампаніі.*

Вывучэнне архітэктурнай спадчыны мінулага, матэрыяльныя артэфакты якой страчаны, уяўляецца для сучаснай навукі неабходнасцю, таму што яна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можа даць адказы на пытанні не толькі па канфесіянальнай гісторыі, але і дапамагчы, напрыклад, архітэктарам у захаванні, аднаўленнні і пераемнасці традыцыйных пабудоў для пэўнага горадабудаўнічага асяроддзя. У гэтым сэнсе прыкладам багацейшага на старажытную архітэктуру горадам, якая, на жаль, не захавалася ў поўным аб'ёме да нашых дзён, з'яўляецца горад Полацк, самы старажытны горад Беларусі.

Першапачаткова Полацак у канфесійным плане быў горадам праваслаўным, каталіцызм пранікае сюды толькі напрыканцы XIII ст. Актыўнае распаўсюджанне каталіцтва пры падтрымцы ўладаў пачалося пасля падпісання Люблінскай уніі і стварэння Рэчы Паспалітай. Для паступовага далучэння мясцовага насельніцтва да новай рэлігіі, у тым ліку, праз адукацыю і выхаванне, Стэфан Баторый у 1580 г. запрасіў езуітаў, якім перадаў значную частку праваслаўных манастыроў і цэркваў з іх маёмасцю. У першай палове XVIII ст. пры кіраўніцтве езуітаў полацкія майстры ўзвялі каменны сабор у гонар Святога Стэфана, які стаў часткай архітэктурнага комплекса Полацкага калегіўма езуітаў.

Вядома, што ў 1735–1738 гг. былі ўзведзены падмурак і сцены сабора манахам ордэна, муляром Б. Мезмерам. Завершана будаўніцтва было ў 1745 г., калі сталяр і муляр А. Лазуровіч паставіў кропку ў будаўніцтве веж сабора і ў запаўненні яго вокнаў. Адразу ж адбылося і асвячэнне сабора. Так, Полацк набыў новы цудоўны твор архітэктуры. Дзве вежы параднага фасада сабора, пабудаванага ў стылі позняга барока, былі ўзнесены на шэсцьдзесят метраў. Каб надаць сабору яшчэ большую веліч, перад саборам дойліды зладзілі плошчу (была сфарміравана ў канцы XVIII ст.), адкуль, якраз насупраць парадных дзвярэй храма, пачыналася галоўная гарадская вуліца – Віцебская. Сабор Святога Стэфана заняў цэнтальнае месца на галоўнай плошчы горада.

Дваццаць гадоў працягвалася ўнутранае аздабленне сабора. На ўпрыгожванне гэтай пабудовы не шкадавалі грошай: ім займаліся нават скульптары і мастакі з Італіі. Іх творчасці належаць мармуровыя калоны, а таксама выдатныя абразы, сярод якіх былі «Сабор святых пакутніц» і «Святая троіца», напісаныя ў Вероне Сальватарам Розай. У 1765 г. у храме з'явіўся алтар, у стварэнне якога ўнёс уклад беларускі мастак Сымон Чаховіч (пазней ён напісаў для калегіўма 44 карціны). Праз год упершыню паспрабаваў свой голас велізарны арган – гэта быў твор Адама Каспарыні.

Пасля далучэння Полацка да Расійскай імперыі і выгнанні езуітаў сабор быў перададзены праваслаўнай царкве, і з 1831 г. пачалася яго мадэрнізацыя. Яна прадугледжвала захаванне манастырскага корпуса, які прымыкаў да храма, уладкаванне аднаго прастола і знішчэнне кафедры ў інтэр'еры. Кантроль за рэалізацыяй праекта перайшоў да мясцовага праваслаўнага архірэя Смарагда (Крыжаноўскага), які абапіраўся на падтрымку генерал-губернатара М. М. Хаванскага.

Перабудова па праекце, «больш прыстасаванаму да стылю грэцкай архітэктуры», каштавала больш за паўмільёна рублёў. Выраблялася замена храмавых ікон, царкоўнага начыння. 23 скрыні з іконамі і пакінутым ад езуітаў царкоўным інвентаром паручнік Вішнякоў у 1843 г. адвёз у Варшаву і здаў памочніку інтэнданта былога каралеўскага замка. Туды ж патрапілі і іконы,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пісаныя Сальватарам Розай. Але некаторыя палотны царкоўнага жывапісу захаваліся пасля рэканструкцыі.

У выніку сабор Святога Стэфана быў пераіменаваны ў Свята-Мікалаеўскі сабор, а плошча, дзе ён размяшчаўся, таксама атрымала новую назву – Корпусная або Парадная [4, с. 275]. Архітэктар А. Порта займаўся рэканструяваннем усяго комплекса езуіцкага калегіўма для размяшчэння там кадэцкага корпуса [1, с. 242]. Асвячэнне ўжо Свята-Мікалаеўскага сабора ў Полацку адбылося 5 лютага 1833 г., крыху пазней ён стаў кафедральным саборам. У 1839 г. сабор быў пераўтвораны ў царкву Полацкага кадэцкага корпуса, з 1865 г. Полацкай ваеннай гімназіі. Па просьбе жыхароў у 1875 г. храм зноў стаў гарадскім саборам. У выніку архіўных пошукаў знойдзены царкоўны вопіс 1894 г., вось вытрымка адтуль: «Будынкам каменная, крыжападобная, алтаром на Захад, з адным купалам і дзвюма вежамі, з якіх у адной уладкавана званіца, а ў другой гадзіннік, сценамі і ў зводах трывалая і дужая» [3, с. 1-3]. З гэтага ж дакумента вынікала, што ў саборы знаходзілася 8 печаў, аднак, з-за адсутнасці дастатковых сродкаў на куплю дроў, ён заўсёды заставаўся халодным.

Фотадакументы фіксуюць, што да сярэдзіны 30-х гг. XX ст. сабор, нягледзячы на змену канфесіянальнай прыналежнасці, не змяніўся вонкава. У 1930-я гг. сабор зачынілі, званы адправілі на пераплаўку, у склепах арганізавалі сховішча для агародніны. Тады ж сабор быў рэканструяваны: ён пазбавіўся двух верхніх ярусаў яго званоў, а таксама быў знішчаны ўнікальны старадаўні гадзіннік з боем працы віленскага майстра Густава Мундзі. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на бамбардзіроўкі і акупацыю, храм выстаяў, там нават праводзіліся богаслужэнні. Сабор стаў хрысціянскім цэнтрам і надзеяй на выратаванне.

Пасля вайны быў запушчаны праект па стварэнні Суvoраўскага вучылішча на месцы былога езуіцкага калегіўма. У гэты час назіралася паступовае разбурэнне сабора, яго стан не адпавядаў нормам помніка архітэктуры, эстэтычны выгляд быў незадавальняючым. Гэта было абумоўлена абыякавасцю савецкіх уладаў да захавання гісторыка-культурнай спадчыны хрысціянства, бо з боку ўладаў праводзілася антырэлігійная кампанія. У выніку было прынята рашэнне аб немэтазгоднасці і немагчымасці рэканструкцыі комплексу, які быў зняты з уліку як помнік гісторыі і культуры. Больш таго, было вырашана знішчыць гэты культавы аб’ект. На яго знішчэнне з бюджэту горада было выдзелена 30 тыс. рублёў [2, с. 26]. Так, у студзені 1964 г. храм быў узарваны, а на яго месцы праз 15 гадоў узнік шматкватэрны жылы дом.

Такім чынам, страчаны сабор Святога Стэфана (Свята-Мікалаеўскі сабор) з’яўляўся галоўным саборам на цэнтальнай плошчы Полацка, адным з цэнтраў хрысціянскага Полацка XVIII – пачатку XX стст. Яго страта, на жаль, змяніла архітэктурны воблік Полацка, але наяўнасць яго ў гісторыі ўзбагаціла насельніцтва горада ў эстэтычным, адукацыйным і духоўным накірунку.

## Літаратура

1. Габрусь, Т. В. і і нш. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь і інш. – Мінск, 2003. – 351 с.

2. Давидович, А. С., Давидович, Т. Л. Костел Св. Стефана в структуре исторического центра Полоцка XVI–XIX веков / А. С. Давидович, Т. Л. Давидович // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия F. Прикладные науки. строительство. – 2008. – № 6. – С. 23–26.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Национальный исторический архив Беларуси (далее – НИАБ). Ф. 2728. Полоцкий Николаевский собор, город Полоцк Полоцкого уезда Витебской губернии. Д.24. Ведомость о соборе за 1894 год и 1895.

4. Чантурия, Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в. / Ю. В. Чантурия. – Минск : Белорусская наука, 2005. – 372 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова